**Мацieўскі, М.** Хіба можна інакш?.. / М. Мацieўскі // Сцяг Ільіча (Талачын). – 1999. – 10 лістап. – С. 2.

## ХІБА МОЖНА ІНАКШ?..

Мінулым летам, у час нарыхтоукі кармоў, з ім так і не давялося сустрэцца.

– Быў тут, падаўся да шэфаў, – гаварылі на сенажаці.

– Міхаіл Міхайлавіч у рамонтнай майстэрні, – сцвярджалі паляводы.

– Шукайце на бурачных палетках, – параілі механізатары.

Нарэшце, работнікі бухгалтэрыі завяршылі гэтую эстафету:

– Новікаў? Ды ён толькі на сесію сельскага Савета пайшоў. Міхаіл Міхайлавіч – дэпутат...

Вось і ўявіце сабе, наколькі чалавек заняты справамі. Міхаілу Міхайлавічу толькі крыху больш трыццаці гадоў, але ж да маладога брыгадзіра усе ў саўгасе «Рыдамльскі» звяртаюцца з павагай, як да старэйшага. Мо і таму, што ён прайшоў жорсткую афганскую вайну, узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «Ад удзячнага афганскага народа» , Знакам ЦК ВЛКСМ «Воинская доблесть» і Ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ.

Ёсць у Міхаіла Новікава, нягледзячы на маладосць, арганізатарскія здольнасці, веданне справы,падыход да людзей, уменне кіраваць імі. Аднак не адразу наладзіліся ў хлопца адносіны з брыгадай. Бо большасць у ёй – людзі намнога старэйшыя, не адзін дзесятак гадоў працуюць у саўгасе.

Брыгадзір успамінае такі выпадак. Адбылося гэта пасля закрыцця нарадаў. Прыйшлі да яго незадаволеныя:

– Што ж гэта атрымліваецца? Працавалі, спіны не разгінаючы, а заробак у брыгадзе – курам на смех?..

Міхаіл было ўжо разгубіўся. Што тут адкажаш – усё разлічана па расцэнках. Падумаў, адказаў спакойна:

– Значыць, хтосьці з вас працаваў горш, не ў поўную сілу.

– А хто ж іменна?

– Гэта брыгадзе і вырашаць...

Пасля таго нядбайным у брыгадзе быў аб'яўлены бой. Усе адзін у аднаго на віду і адлыньваць ад справы, калі побач твой таварыш аддае рабоце ўсе сілы, стала проста немагчыма. А Міхаіл зрабіў для сябе вывад: людзей на работу размяркоўваць так, каб сілы напарнікау па заданню былі прыкладна роўнымі. У выніку той канфлікт з зарплатай быу апошнім.

Міхаіл Новікаўзасвоіў нескладаную ісціну: нішто так не натхняе людзей, як асабіс-ы прыклад кіраўніка. А калі так, значыць дома няма чаго заседжвацца. Разам з усімі выходзіць сціртаваць салому, бярэ ў рукі касу, збівае ёю ў тугі валок сакавітую траву.

Адзінства мэт, адзінства імкненняў – вялікая заслуга. Ён вёў калектыў да новых вышынь. Узраслі ў брыгадзе ўраджаі. Нават сёлета тут сабралі па 20 цэнтнераў з гектара, а бульба дала звыш 200 цэнтнераў.

– Добра, канечне, урадзіла бульба, – гаворыць ён. – Але будзе больш, калі смялей пачнём укараняць высокаўраджайныя сарты. Успамінаю, як выпрабоўвалі сорт «явар» на нашых палях. Сам працаваў на саджалцы. Да восені сачыў за развіццём раслін. Прыйшоў да вываду –

перспектыва ў сорту выдатная. Па 250 цэнтнераў даў гектар. Будзем у будучым годзе расшыраць пад «явар» плошчу. Людзі адзначылі ў сваім важаку галоўнае – справядлівасць. А да такіх заусёды цягне. Вечарам не не ды і загляне хто-небудзь да брыгадзіра:

– Я да вас, Міхайлавіч. Не перашкоджу?

– Што вы, сядайце.

– Што рабіць, сын ад рук зусім адбіўся, толькі двойкі са школы прыносіць...

– А ў школе даўно былі? Тое і яно. Вось бярыце заўтра выхадны.

– А іншы хоча радасцю падзяліцца: сын з арміі фотаздымак прыслаў, выдатнікам служыць. У кагосьці, наадварот, у сям'і штосьці не ладзіцца. І да Міхаіла Новікава з усім гэтым. Таму і выбралі свайго брыгадзіра дэпутатам сельскага Савета.

...Працаваў у саўгасе юнак. Прозвішча называць не варта – справа мінулая. Ні добры, ні дрэнны быў трактарыст – так сабе, сярэдні. І, бачна, захацелася яму чагосьці надзвычайнага . Раз–другі Міхаіл заўважыў яго навесяле. У клубе, калі людзі глядзелі кінафільм, гучна адпускаў нядобрыя рэплікі. Неяк пасля такога чарговага «сеанса» Новікаў спытаў яго, спытаў прама:

– Табе што, вельмі хочацца звярнуць на сябе ўвагу?

І яшчэ з ім размова адбылася. Пасля яе юнак цвёрда паабяцаў:

– Паступлю завочна у тэхнікум. Больш нічога дрэннага за мной не заўважыце.

Пры сустрэчы я спытаў Міхаіла, ці цяжка спалучаць клапатлівую пасаду брыгадзіра з грамадскай работай.

– Мне гэта толькі дапамагае, – адказаў ён. – Як дэпутат, я больш пазнаю людзей. А гэта вельмі важна для брыгадзіра. Хіба можна інакш?..

**Мікола Мацеўскі**